*Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі*
*“Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі*
*“Світанак” Пухавіцкага раёна”*



# Творчая майстэрня
# Выраб пано ў тэхніцы “Огаўскі роспіс”

*распрацавала ГНЯЎЧЫНСКАЯ Л.М.,*
*педагог дадатковай адукацыі*

## Неабходныя матэрыялы і прылады:



грунтаваны ватман альбо ДВП
плоскія пэндзлі
гумка
гуаш
клей ПВА
гліцэрына
слоік для вады
анучка
палітра






# Парадак выканання работы



***1. Выкананне фляндроўкі.***

Падрыхтаваць фарбу неабходнага колеру. Для гэтага ў фарбу дадаюць клей ПВА і трохі гліцэрыны, добра вымешваюць. Падрыхтаваная фарба не павінна быць занадта вадкай, ці вельмі густой. На паверхню нанесці фарбу, а затым з дапамогай гумкі правесці прамыя і дробава-хвалістыя лініі, як на аўтэнтычных куфрах. Гумку трымаюць вялікім і паказальным пальцамі і хвалепадобнымі рухамі рукі фляндруюць. Працаваць трэба досыць хутка, бо ў адрозненне ад алейнай фарбы, гуаш сохне хутка.

**2. Маляванне контуру букета па сырым фоне.**

Малюнак наносяць адваротнай стараной пэндзля. Пачынаюць з малюнка буйнай ніжняй кветкі з групай лісця, калі яны ёсць на эскізе ў цэнтры кампазіцыі. Затым малююць дзве верхніх кветкі, злучаюць іх лісцем, прамежкі запаўняюць дробнымі злучнымі элементамі з кветак, гронак ягад і г.д. Малюнак кожнай асобнай кветкі пачынаюць з асяродку, затым малююць ніжнюю і верхнюю часткі кветкі. Наносяць дэкаратыўныя рыскі, кропелькі, блікі.






***3. Выкананне падмалеўка.*** Пасля высыхання паверхні кветкі і лісце прапісваецца бяліламі, т.е. выконваюць падмалевак. У фарбу для падмалёўка трэба дадаць клей *ПВА*. Калі пры высыханні фарба асела, г.зн. скрозь нанесены тон прасвечвае фон, неабходна прапісаць гэты элемент яшчэ раз.

***4.Роспіс кампазіцыі асноўнымі танамі.*** Бяруць яркія, насычаныя колеры, абмяжоўваючыся , як правіла, 5-7 каляровымі танамі. Пры каларыстычным вырашэніі працы скарыстоўваюць розныя выгляды кантрасту.  Адны і тыя ж асноўныя дамінантныя і іншыя каляровыя тоны рытмічна размяркоўваюць па ўсёй паверхні работы. Пры выкананні размалёўкі складанай кветкі выкарыстоўваюць некалькі колераў.



***5. Ажыўка.*** Працу скanчаюць нанясеннем на пялёсткі кветак і лісце цёмных ці светлых ажывак у выглядзе дэкаратыўных рысак, кропак, блікаў. Для дапрацоўкі дробных дэталяў малюнка можна выкарыстоўваць розныя прыёмы. Напрыклад, пражылкі на лісці, розныя рыскі можна вырабіць спосабам фляндравання г.зн. прадрапаннем сырой фарбы. Розныя кропкі ці венцы дробных кветак можна вырабіць цацкаваннем. У якасці штампа пры гэтым можна выкарыстоўваць тупы канец алоўка ці палачкі. Кропелькі, блікі можна вырабіць вольным пісьмом. Усе гэтыя прыёмы разнастаяць працу, робячы яе больш дэкаратыўнай.

***6. Пасля поўнага высыхання фарбы***, работа лакіруеца. Афармляць у рамку такую работу не абавязкова. **Творчага натхнення!**